ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (1248) ● 21 чэрвеня 1979 г. Цана 2 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПРАЦЯГВАЮЦЦА ЭКЗАМЕНЫ ● У АБ'ЕКТЫВЕ — КАНСТРУКТАРСКАЕ БЮРО БДУ ● ПОСПЕХІ ФАРМІРАВАННЯЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АБАРОНЫ ● ВОПЫТ АТЭІСТЫЧНАЙ ПРАПАГАНДЫ—У МАСЫ ● БАРАЦЬБА ЗА МІР — СПРАВА ЎСЕАГУЛЬНАЯ ● «РАМОНАК». КЛУБ АМАТАРАЎ ПРЫРОДЫ ● СТУДЭНЦКАЯ СТАЛОВАЯ Ў СЕСІЮ. ЯК ВАС АБСЛУГОЎВАЮЦЬ? ● ТАБЕ, БАЕЦ СБА: КАЛІ ХОЧАШ БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ ● НА АЛІМПІЙСКІХ АБ'ЕКТАХ.

ДЗЁННІК СЕСІІ

# «Цішэй, ідзе экзамен!»

У гэтыя дні самае папулярнае слова ва універсітэце — сесія. Аб ёй размовы ў студэнтаў і выкладчыкаў, з-за яе ўсе хваляванні і перажыванні.

Ажыўлена ў аўдыторыях і калідорах універсітэта. Ды гэта і зразумела. Адказная пара зараз у студэнтаў.

У разгары сесія на адным з буйнейшых факультэтаў — гістарычным. Дэканат, партбюро шмат зрабілі для таго, каб сесія прайшла арганізавана. Экзамены пачынаюцца ў строга вызначаны час. Пры ацэнцы адказаў студэнтаў выкладчыкі ўлічваюць і такія фактары, як наведванне лекцый і практычных заняткаў на працягу семестра, добрае вядзенне канспектаў, удзел у навукова-даследчай рабоце і інш.

Ужо першыя экзамены паказалі, што студэнты ў асноўным глыбока вывучылі матэрыял, добра арыентуюцца ў сучаснай міжнароднай абстаноўцы, умела прымяняюць атрыманыя веды ў практыцы камуністычнага будаўніцтва.

Тон у сесіі задаюць іменныя стыпендыяты, выдатнікі вучобы. Студэнты - пяцікурснікі В. Шорэц, Л. Лятко, А. Кішкевіч, У. Нікіценкаў, Т. Павалізіна і іншыя не толькі самі здаюць усе экзамены на выдатна, але і аказваюць вялікую дапамогу сваім аднакурснікам і студэнтам малодшых курсаў.

Поспех заўсёды спадарожнічае найбольш падрыхтаваным. Па-ранейшаму добра здаюць экзамены студэнты III курса аддзялення палітэканоміі, якія ў мінулым годзе сталі пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва акадэмічных груп ВНУ нашай рэспублікі.

Студэнты I курса пакуль здалі адзін экзамен. Трэба адзначыць, што старт узят добра, здавальняючых адзнак амаль няма. Думаецца, што і наступныя экзамены першакурснікі вытрымаюць.

Гістарычны факультэт рыхтуецца правесці ў жыццё сваіх выпускнікоў. Закончылася абарона дыпломных работ, паспяхова завяршаюцца дзяржаўныя экзамены. Хутка дыпломы атрымаюць больш як 230 студэнтаў-пяцікурснікаў (па ўсіх формах навучання).

У гутарцы з нашым карэспандэнтам дэкан факультэта, прафесар І. О. Царук адзначыла: «Першыя ж экзамены паказалі, што студэнты добрасумленна працавалі на працягу семестра, сур'ёзна ставяцца да экзаменацыйнай сесіі, вельмі стараюцца здаць экзамены як мага лепш. Арганізаванаму ходу сесіі ў многім дапамагаюць экран бягучай паспяховасці і экран сесіі, якія пастаянна вядуцца на факультэце.

Ужо 2 гады наш факультэт здзяйсняе падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для замежных краін. У нас навучаюцца 74 студэнты з 8 краін свету. Гэтыя студэнты таксама старанна вучацца. Асабліва вызначаюцца юнакі і дзяўчаты з ГДР, Лаоса, рад студэнтаў з Кубы.

Адразу ж вызначылася заканамернасць: хто настойліва авалодваў ведамі на працягу семестра, той і зараз атрымлівае высокія адзнакі. Спадзяёмся, што сесія на гістфаку завершыцца паспяхова».

***

Чацвёрты паверх галоўнага корпуса, механіка-матэматычны факультэт. Перад намеснікам дэкана факультэта А. А. Бурдуном ляжаць вялікія аркушы паперы, на якіх адзначаны вынікі здачы кожнага экзамена: выдатныя адзнакі—чырвоным колерам, добрыя—зялёным, астатнія—чорным. Адразу бачна, што пераважваюць «чырвоныя» і «зялёныя».

— Так, — зазначае Аляксей Аляксандравіч, — вынікі летняй экзаменацыйнай сесіі нас радуюць. Асабліва добрыя яны ў студэнтаў 1-й групы II курса, якія здалі ўжо 3 экзамены і амаль без троек. Упэўнена здае і першы курс. Такі складаны экзамен, як матэматычны аналіз, яны здалі ў асноўным на «чатыры» і «пяць», ёсць некалькі здавальняючых адзнак, але ніводнага «правалу».

Трэба адзначыць, што ў гэту сесію наогул знізілася колькасць здавальняючых і нездавальняючых адзнак у параўнанні з зімовай, хаця летняя сесія больш складаная і насычаная.

Добра здаюць экзамены і студэнты III курса педагагічнага патока.

Асабліва нас радуюць поспехі чацвёртакурснікаў. Усе экзамены яны здаюць роўна, упэўнена, без зрываў.

Напярэдадзе, як заўсёды, нашы выдатнікі, лепшыя студэнты— А. Баданіна, С. Сяргееў, Н. Штомпель і іншыя.

Паспяхова прайшла абарона дыпломных работ і здача дзяржаўных экзаменаў. У канцы гэтага тыдня на факультэце адбудзецца ўручэнне дыпломаў пяцікурснікам. Каля 250 маладых спецыялістаў адправіцца ў вялікае жыццё наш факультэт.

***

З дня на дзень сесія набірае тэмп. У пачатку ліпеня яна завершыцца на ўсіх факультэтах. Студэнты паедуць на практыку, у будатрады, на адпачынак. А зараз на дзвярах многіх аўдыторый мы бачым такі знаёмы надпіс: «Цішэй, ідзе экзамен!».

Л. АНДРЭЕВА.

## Поспех дасягнут

Выконваючы задачы па далейшаму ўдасканаленню грамадзянскай абароны, фарміраванні універсітэта дабіліся высокіх паказчыкаў, якія былі абумоўлены сістэматычнымі заняткамі і трэніроўкамі на мясцовасці.

У дзень правядзення раённых спаборніцтваў па грамадзянскай абароне нашы каманды сувязі і разведкі прадэманстравалі выдатную вывучку, высокі спартыўны напал і арганізаванасць. Сярод камандраёна яны занялі першае месца і ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі выканкома.

У ходзе спаборніцтваў асабліва выдзеліліся камандзіры каманд А. Гайдук і М. Мароз, радысты В. Ярмоленка і П. Стасевіч, а таксама хімікі-разведчыкі В. Цітоў, В. Дубовік, І. Турко і В. Кузьміч.

Паспяховае выступленне фарміраванняў ГА універсітэта стала магчымым дзякуючы настойлівай і актыўнай метадычнай рабоце выкладчыкаў спецыяльнай кафедры В. С. Мяцеліцы і Ю. А. Макарава.

За высокія паказчыкі ў падрыхтоўцы фарміраванняў і дасягнутыя вынікі на спаборніцтвах рэктаратам універсітэта заахвочаны ўсе асабліва вызначыўшыяся студэнты і выкладчыкі.

А. СЯДОЎ,
начальнік штаба грамадзянскай абароны.

# ПРАЦУЮЦЬ КАНСТРУКТАРЫ

**Каля чатырох гадоў назад пры Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна створана спецыяльнае канструктарска-тэхналагічнае бюро з вопытнай вытворчасцю. Сэрцам яго стаў аддзел № 25.**



**Заходзім у аддзел. Нехта робіць апошнія разлікі. Павольна вымалёўвае лініі новага блока канструктар І катэгорыі ўдарнік камуністычнай працы Н. Пісарык.**

**— Для канструктара адной з самых галоўных якасцей з'яўляецца тое, што ён павінен ужо хаця ў кожнага свой вузел, свой блок. У штрыхах і лініях нараджаецца новае. Спачатку ўсё толькі на паперы.**

**Доўгі і цяжкі шлях нараджэння.**

**Канструктарам ёсць чым ганарыцца. Яны адыгралі не апошнюю ролю ў падрыхтоўцы на паперы рэальна ўяўляць абсталяванне, распрацоўваемае ім, павінен бачыць усю работу механізмаў, — гаворыць ён.**

**Работа ўсіх падпарадкавана адной задуме, адной ідэі, і распрацоўцы метэаралагічнага аўтаматычнага ранцавага комплексу «Марк», які заваяваў першы прыз на выстаўцы БДУ імя У. І. Леніна, прысвечанай 60-годдзю БССР і КПБ, і зараз экспануецца на ВДНГ СССР, «Многаканальнага рэгістра аднакратных сігналаў», які атрымаў дыплом II ступені на ВДНГ БССР.**

**Толькі ў першым квартале гэтага года канструктарамі пададзена 10 заяў на мяркуемыя вынаходніцтвы.**

**Новыя задумы, новыя рашэнні, праекты...**



**НА ЗДЫМКАХ: ударнік камуністычнай працы Н. Пісарык; загадчык сектара В. М. Залётны і канструктар І катэгорыі Л. С. Дароніна за дапрацоўкай новага блока.**

**Фота і тэкст В. Шубы.**

# Барацьба за мір—справа ўсенародная

Прафесарска-выкладчыцкі састаў, аспіранты: і супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна добраахвотна і актыўна ўдзельнічаюць у Савецкім Фондзе міру.

Групы садзейнічання Фонду міру, створаныя на факультэтах, вядуць прапаганду міралюбівай знешняй палітыкі КПСС і Савецкага ўрада, выхоўваюць студэнтаў у духу савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму. Яны прапагандуюць задачы і дзейнасць Савецкага Фонду міру па аказанню матэрыяльнай падтрымкі замежным рухам, арганізацыям і асобам, вядучым барацьбу супраць агрэсіўных дзеянняў імперыялізму, за захаванне міру ва ўсім свеце, за развіццё дружбы, узаемаразумення і салідарнасці паміж народамі, арганізуюць прапаганду добраахвотных укладаў у Фонд міру ад супрацоўнікаў і студэнтаў.

Найбольш актыўна удзельнічалі сваімі укладамі ў Фонд міру ў 1978 годзе супрацоўнікі і студэнты гістарычнага і механіка-матэматычнага факультэтаў.

У 1979 годзе напярэдзе па суме добраахвотных узносаў у Фонд міру ідуць механіка-матэматычны факультэт, факультэт прыкладной матэматыкі і СКТБ з ВВ.

У папаўненні Фонду міру ўвесь час удзельнічаюць нашы вучоныя: У. А. Белы, Д. Б. Мельцар, Л. М. Шнеерсон, Г. М. Трухноў, Г. М. Ліўшыц, Р. Габасаў, Г. А. Гуманскі, В. І. Вядзернікаў, І. А. Прусаў, А. М. Саржэўскі, А. С. Каспяровіч, Г. М. Волахаў, Л. Ф. Яўменаў і іншыя.

Аднак у гэтай важнай грамадскай справе ёсць яшчэ і недахопы. Не ўсе вытокі ўзносаў у Фонд міру намі выкарыстоўваюцца поўнасцю. Напрыклад, прэміі, узнагароды за вынаходніцтвы і рацыяналізатарскія прапановы.

Растлумачальная работа ў СБА па адпрацоўцы 1—2 дзён у Фонд міру і залічэнню героўкамсамольцаў у СБА з перадачай іх зарплаты ў Фонд міру хаця і вядзецца, але даных аб суме такіх узносаў мы не маем. У нас няма патрэбнага ўліку і шырокага інфарміравання грамадскасці аб патрыятычных і інтэрнацыянальных справах людзей, працуючых у СБА.

Неабходна, каб камандзіры і камісары СБА пасля выканання работ працоўнага семестра мелі адпаведныя дакументы, па якіх маглі б далажыць у камітэт камсамола аб адлічэнні ў Фонд міру іх атрадамі.

Няхай штогод удзел у Фондзе стане слаўнай традыцыяй усіх калектываў, няхай пасільны ўклад кожнага, дапоўніць уклады іншых, паслужыць высакароднай справе абароны міру ва ўсім свеце!

**М. ШАРЫ,**
**старшыня камісіі садзейнічання Савецкаму Фонду міру БДУ.**

КОЖНЫ член створанага пры парткоме БДУ савета па атэістычнаму выхаванню адказвае за сваю, вызначаную частку работы. Старшы выкладчык кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму Еўдакія Іосіфаўна Шмаргунова вось ужо чацвёрты год вядзе тэарэтычны семінар «Актуальныя праблемы атэістычнага выхавання» ва універсітэцкай бібліятэцы.

— Трэба адзначыць, што аўдыторыя ў мяне вельмі ўдзячная, — лічыць Еўдакія Іосіфаўна, — супрацоўнікі бібліятэкі—слухачы дастаткова падрыхтаваныя. Працаваць з імі цікава, падводзячы вынік, адказвала на пытанні, выкліканыя чарговым дакладам.

Асаблівасцю правядзення семінара ў бібліятэцы было тое, што часта пасля абмеркавання чарговай тэмы або ў якасці прыкладу па ходу абмеркавання гаварылі аб прачытаных кнігах, або нядаўніх публікацыях у часопісах. Згаджаліся або не згаджаліся з аўтарамі, спрачаліся.

— Ні разу не было, каб семінар наш скончыўся своечасова,—расказвае старшы бібліятэкар Зінаіда Максімаўна Шалупенка, адна з асабліва актыўных удзельніц семінара. — Тое новае, аб чым мы даведваліся на занятках, нараджала шмат пытанняў, якія патрабавалі неадкладнага абмеркавання.

З кожным годам ускладнялася тэматыка атэістычнага семінара. Магчыма таму ў гэтым навучальным годзе крыху паменшылася колькасць дакладаў, падрыхтаваных самімі бібліятэкарамі. Іх часцей гасцямі сталі супрацоўнікі навуковых кафедр універсітэта. Семінар па тэме «Аграрная палітыка партыі ў дзеянні і асаблівасці атэістычнага выхавання на сяле (да вынікаў ліпеньскага Пленума ЦК КПСС 1978 г.)» правёў дацэнт кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў М. А. Жылінскі. З тэмай «Новая Канстытуцыя СССР і пытанні дэмакратыі і свабоды сумлення» больш падрабязна пазнаёміў І. Ф. Рэкуць, дацэнт кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму.

# Вопыт атэістычнай прапаганды—у масы

26 чалавек сталі ў 1975 годзе першымі ўдзельнікамі семінара. Састаў слухачоў крыху змяніўся, але колькасць павялічылася. Цяпер іх—28.

Пачыналі з лекцый агляднага характару. Аб сацыяльнай ролі рэлігіі расказала дацэнт кафедры Інэса Міхайлаўна Квашніна. Рэлігійнае становішча ў СССР ахарактарызавала сама Еўдакія Іосіфаўна. А потым па распрацаванай тэматыцы даклады рыхтавалі ўдзельнікі семінара. Пазнаёміліся з асноўнымі веравучэннямі. Заняткі семінара прысвячаліся такім, напрыклад, тэмам: «Прычыны ўзнікнення хрысціянства», «Ідэалогія і палітыка сучаснага каталіцызму», «Рашэнні II Ватыканскага сабора ў дзеянні». Некалькі разоў Еўдакія Іосіфаўна заказвала да чарговых заняткаў кінафільмы па атэістычнай прапагандзе.

— Выявілася, што мы вельмі мала ведалі аб рэлігіі і атэістычнай рабоце,—гаворыць цяпер удзельнікі семінара, — часам лічылі бяскрыўдными ўсе гэтыя веравані асобных людзей. Не заўсёды бачылі неабходнасць атэістычнай работы. Семінар дапамог больш рэальна паставіцца да гэтых пытанняў, узброіў канкрэтнымі ведамі.

Яны не былі пасіўнымі слухачамі, бібліятэкары. Калі на другі год работы семінара больш увагі стала аддавацца атэістычным пытанням, выступленні на семінары сталі больш канкрэтнымі, больш звязанымі з жыццём, з міжнародным становішчам. Напрыклад: «Развіццё атэізму — заканамернасць сацыялізма развіцця», «Атэізм і ідэалагічная барацьба ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС», «Развіццё атэізму ў СССР за 60 год Савецкай улады».

А колькі цікавых прыкладаў прыводзілася, колькі пытанняў задавалася! У канцы кожных такіх заняткаў Еўдакія Іосіфаўна, падводзячы вынік...

Семінар, як адзначае Еўдакія Іосіфаўна Шмаргунова, першапачаткова быў разлічан толькі на два гады. Але калі была вычарпана запланаваная тэматыка, слухачы папрасілі прадоўжыць яго — прыцягвала тэматыка, прыцягвала цікавая, жывая, захапляючая манера правядзення заняткаў. Тут трэба адзначыць зайздроснае ўменне Еўдакіі Іосіфаўны не паўтарацца ў падачы фактаў, уменне наладзіць кантакт з аўдыторыяй, улавіць яе запыты і пажаданні.

Трэці год заняткаў вырашылі прысвяціць тэме «Атэізм і рэлігія ў сацыялістычным грамадстве». Былі прачытаны і абмеркаваны лекцыі «Марксісцка-ленінскае і буржуазнае разуменне свабоды сумлення ў святле матэрыялаў нечарговай VII сесіі Вярхоўнага Савета СССР», «Новая Канстытуцыя СССР аб свабодзе адпраўлення рэлігійнага культу і свабодзе атэістычнай прапаганды», «Навуковыя асновы палітыкі КПСС у адносінах да рэлігіі і царквы».

Закончылі год тэмай «Месца і роля бібліятэк у навукова-атэістычным выхаванні».

Ці змянілася што-небудзь у рабоце універсітэцкай бібліятэкі пасля паяўлення тэарэтычнага семінара?

Так, змянілася, лічаць самі супрацоўнікі. Матэрыялы па атэістычнай прапагандзе сталі часцей выкарыстоўвацца ў выстаўках і падборках кніг. А ў традыцыйных штотыднёвых аглядах літаратуры, якая паступіла ў бібліятэку, сталі асобнай падборкай вызначаць кнігі па атэізму. У планах удзельнікаў семінара на бліжэйшы час — афармленне кутка па атэістычнай прапагандзе.

Дарэчы, ён жа правёў з бібліятэкарамі цікавую гутарку аб рэлігійных абрадах і народных звычаях. Што толькі не цікавіла слухачоў: гісторыя ўзнікнення абрадаў і іх праявядзенне прадстаўнікамі розных рэлігій, сувязь абрадаў з порамі года і культавыя святы Старажытнай Русі, забабоны, якія дайшлі да нашых дзён...

Можна лічыць, што ўдзельнікаў семінара не 28, як па спісу, а значна больш, бо ўсё новае, цікавае з успрынятага на лекцыях становіцца потым прадметам абмеркавання амаль усяго калектыву, выкарыстоўваецца ў рабоце з чытачамі.

На пытанне аб найбольш актыўных членах семінара старшы бібліятэкар аддзела абслугоўвання Наташа Сяргеева, цяперашні стараста семінара, і старшы бібліятэкар Зінаіда Максімаўна Шалупенка, якая была старастай да нядаўняга часу, адказалі, што цяжка было вызначыць кагосьці аднаго. Усе слухачы вельмі зацікаўлены тэматыкай. Усе з задавальненнем выбіраюць тэмы і рыхтуюць даклады, стараючыся адкрыць нешта новае для астатніх. Усе без выключэння ў канцы кожных заняткаў задаюць шмат пытанняў, што само па сабе, безумоўна,—сведчанне не фармальных адносін да семінара. Актыўней за іншых, бадай, Лідзія Сцяпанаўна Ваньшына, Раіса Іосіфаўна Ляховіч, Зінаіда Дзмітрыеўна Калеснікава.

Але душа семінара, яго ідэйны натхніцель, што сумела зацікавіць людзей, прывіць цягу і патрэбу да ведаў па пэўнай тэматыцы, — кіраўнік атэістычнага семінара Еўдакія Іосіфаўна Шмаргунова.

**Т. САХАШЧЫК.**

# Гілер Маркавіч Ліўшыц

## (ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)



Гілер Маркавіч Ліўшыц нарадзіўся 25 чэрвеня 1909 года ў м. Дараганава Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і служачага. Пасля заканчэння школы ён некалькі год працаваў столярам. У 1931 годзе Г. М. Ліўшыц паступіў на сацыяльна - эканамічны факультэт Мінскага педінстытута, які паспяхова закончыў у 1934 годзе. Яго пакінулі ў аспірантуры, адначасова даручылі чытаць лекцыі па старажытнай гісторыі і гісторыі сярэдніх вякоў на гістарычным факультэце і неспецыяльных факультэтах. На факультэце замежных моў ён чытаў лекцыі па гісторыі Англіі, Францыі і Германіі. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны Г. М. Ліўшыц па сумяшчальніцтву працаваў у БДУ, у юрыдычным інстытуце, у інстытуце нацыянальных меншынстваў і ў беларускім філіяле ваеннай палітычнай акадэміі імя У. І. Леніна. У 1939 годзе Г. М. Ліўшыцу была прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук, а ў 1940 годзе — званне дацэнта.

З чэрвеня 1941 года да кастрычніка 1941 года Г. М. Ліўшыц знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі. Са зброяй у руках абараняў Радзіму, а пасля дэмабілізацыі працаваў дацэнтам у Кзыл-Ардынскім педінстытуце (да верасня 1944 года).

З кастрычніка 1944 года Г. М. Ліўшыц працуе ў БДУ імя У. І. Леніна.

У 1960 годзе Г. М. Ліўшыц абараніў доктарскую дысертацыю па гістарычных навуках, а ў 1975 годзе — доктарскую дысертацыю па філасофскіх навуках.

Г. М. Ліўшыц надрукаваў звыш 125 навуковых прац, сярод якіх 14 кніг і 3 брашуры. Агульны аб'ём апублікаваных прац складае звыш 330 аўтарскіх аркушаў. Акрамя гэтага, ён падрыхтаваў да друку кнігу «Рэлігія і царква ў гісторыі грамадства» і брашуру «Крытыка багаслоўскіх і буржуазных канцэпцый па пытанню паходжання хрысціянства». Г. М. Ліўшыц прыняў удзел у рэдагаванні 10 кніг, 4 з якіх — дапаможнікі для студэнтаў па навуковаму атэізму. Ён удзельнічаў і ў напісанні гэтых дапаможнікаў. Чатыры яго артыкулы надрукаваны ў ГДР на нямецкай мове. У штогодніку Вялікай Савецкай Энцыклапедыі за 1958 год кніга Г. М. Ліўшыца «Класавая барацьба ў Іудзеі і паўстанне супраць Рыма» аднесена да важнейшых прац савецкіх гісторыкаў па ўсеагульнай гісторыі ў 1957 годзе. У штогодніку Вялікай Савецкай Энцыклапедыі за 1961 год да важнейшых прац савецкіх гісторыкаў па ўсеагульнай гісторыі, выдадзеных у 1960 годзе, аднесена кніга Г. М. Ліўшыца «Сацыяльна-палітычная барацьба ў Рыме I ст. да н. э. і змова Катыліны». У штогодніку Вялікай Савецкай Энцыклапедыі за 1962 год аднесена да важнейшых работ кніга Г. М. Ліўшыца «Рэлігія і царква ў мінулым і сучасным».

Кола навуковых інтарэсаў Г. М. Ліўшыца вызначаецца шырынёй дыяпазону. Дзве яго манаграфіі і рад артыкулаў прысвечаны сацыяльна-эканамічным і палітычным адносінам у старажытным Рыме. У трох кнігах даследуюцца кумранскія тэксты і праблемы паходжання хрысціянства, а таксама даецца агляд біблейскай крытыкі на працягу стагоддзяў. У адной кнізе выкладаецца ход рэфармацыйнага руху ў Чэхіі і Германіі. У астатніх кнігах, брашурах і артыкулах асвятляецца гісторыя матэрыялістычнай філасофіі, вальнадумства і атэізм у многіх краінах.

Сваю педагагічную і навуковую дзейнасць Г. М. Ліўшыц спалучае з вялікай грамадскай работай. У 40—60-х гадах ён чытаў шмат лекцый па пуцёўках ЦК КПБ, Мінскага абкома партыі і таварыства «Веды». Ён неаднаразова выступаў з лекцыямі і дакладамі на семінарах прапагандыстаў. На працягу раду год ён чытаў лекцыі ў вячэрнім універсітэце марксізму - ленінізму. У рэспубліканскім друку Г. М. Ліўшыц змясціў звыш 20 артыкулаў, у другой палове 50-х і ў пачатку 60-х ён узначальваў групу таварыства «Веды» на гістарычным факультэце. Г. М. Ліўшыц з'яўляецца членам атэістычнай секцыі рэспубліканскага таварыства філасофаў. Ён— член рэдкалегіі часопіса «Веснік БДУ» (серыя III). На працягу раду год Г. М. Ліўшыц быў праформам гістфака і членам прафбюро гэтага факультэта. Ён з'яўляецца старшынёй савета па атэізму пры парткоме БДУ.

Г. М. Ліўшыц узнагароджаны ордэнам Знак Пашаны, шасцю медалямі, дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Граматай Вярхоўнага Савета Казахскай ССР, Граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і прэзідыума праўлення Таварыства «Веды» БССР. У красавіку 1979 года Г. М. Ліўшыцу прысвоена ганаровае званне Заслужанага дзеяча навукі БССР.

**Калектыў супрацоўнікаў.**



**Экзамен па квантавай механіцы выкладчыку Г. В. Шышкіну здае студэнт з Гвінеі Якуба Кондэ.**

Фота **М. Дубовіка.**



# БЕРАЖЫЦЕ КВЕТКІ





Кветкі — адно з самых дзіўных і дасканалых цудаў прыроды. У маленькім люціку ці адуванчыку, у згубіўшымся сярод хлябоў васільку ці кветцы дзікага маку закладзена дабратворная для чалавека сіла эмоцый, энергія радасці. Відовішча цвітучага куста, саду, паляны аблагароджвае і супакойвае, настройвае думкі на ўзвышаны лад, пабуджае імкнуцца да цудоўнага. Няхай больш будзе кветак, няхай захоўваюцца яны як мага больш там, дзе растуць!

Аднак многія лічаць інакш: калі кветка папалася на вочы, яе абавязкова трэба сарваць. Успомніце цэлыя снапы лясных і палявых кветак, якія некаторыя «прыродалюбы» (ды чаго грахі таіць, часам і мы з вамі!) вязуць пасля адпачынку на ўлонні прыроды ў вагонах прыгарадных паяздоў, аўтобусах, машынах. Большая частка кветак, якія ператварыліся ў бляклыя венікі, у той жа дзень будзе выкінута ў скрынку для смецця. І колькі палян, узлескаў пазбавіліся сваёй прыгажосці, абясцвеціліся з-за варварскага жадання абавязкова сцягнуць дадому як мага больш прыроднай прыгажосці!

Горналыжнікі вязуць з гор ахапкі вечназялёных рададэндронаў. Гэтыя расліны не аднаўляюцца дзесяцігоддзямі. Аматары лодачных прагулак выдзіраюць на сваім шляху ўсе гарлачыкі і выкідваюць тут жа завяўшыя кветкі, пазбаўляючы ваду яе цудоўных, глядзячых у неба беласнежных вачэй. Абломваюць бархатныя шапкі рагозы, калечаць берагі азёр. А дома гавораць:

— Ад гэтага чароту толькі пух і гразь.

Цвіценне чаромхі ператварылася ў сапраўднае няшчасце для лясоў: «аматары прыроды», нібы статак дзікіх сланоў, ламаюць і знявечваюць квітнеючыя дрэвы на сотнях гектараў.

Мы збіраем кветкі, зрываючы, зразумела, самыя лепшыя, самыя прыгожыя з іх. У выніку такой «селекцыйнай работы» драбнее і знішчаецца жывая прырода, якая акружае нас, якая існуе вакол нас.

Ці значыць гэта, што зусім нельга збіраць кветкі? Зразумела, не! Але гэта трэба рабіць умела, не забываючы аб шкодзе, якая будзе нанесена прыродзе. Не трэба скнарнічаць: дзесятак кветак, галінка чаромхі—дастатковая даніна раслiннага міру, здольная ўпрыгожыць нашу кватэру.




**Як бы ты не збіраўся праводзіць летнія канікулы: ці паехаць куды-небудзь на практыку ці проста дадому, да бацькоў, ці працаваць у будатрадзе, ці пайсці ў турысцкія падарожжы, — у любым выпадку абавязкова ты сустрэнешся з прыродай. І таму, жадаючы табе цікава, весела правесці канікулы, «Рамонак» лічыць не лішнім даць некалькі парад на лета. Такім чынам...**

# Каб не прынесці шкоды

**(ПАРАДЫ АДПАЧЫВАЮЧЫМ)**

1. Памятайце: шчасце падарожжаў, палявання, рыбнай лоўлі, збору ягад і грыбоў, адпачынку на ўлонні прыроды толькі тады поўнае, калі чалавек выступае як сябар усяго жывога і як руплівы гаспадар усіх прыродных багаццяў.

2. Не забывайце, што рубка лесу, паляванне на птушак і звяроў, лоўля рыбы адбываюцца па пэўных правілах і законах. Каб не прынесці прыродзе шкоды, трэба ведаць і прытрымлівацца гэтых правілаў і законаў.

3. Калі вы знайшлі ласёнка, зайчонка або маладняк іншых звяроў і птушак, не чапайце іх, не бярыце дадому — дома яны хутчэй за ўсё загінуць. Лепш, чым бацькі, ніхто не створыць ім неабходных умоў для росту і развіцця.

4. Нельга браць яйкі з гнёздаў, разбураць мурашнікі і раскопваць норы. Пажадана, каб чалавек, які назірае або фатаграфуе птушку, звера, гняздо, нару, знаходзіўся ля іх на працягу самага кароткага часу: працяглы неспакой жывёл адмоўна адбіваецца на выніках наседжвання яек і ўскормлівання маладняку.

5. Сцежкі жывёл, якія б яны ні былі крутыя, аказваюцца самымі надзейнымі шляхамі, каб выбрацца з густога зарасніку або гразкіх месц.

6. Месцы купання неабходна папярэдне даследаваць. Калі цела разагрэта паходам, пераносам цяжкасці, яго трэба ахаладзіць да нармальнага стану, а затым ужо купацца.

7. Рыбу, якая пахне цінай, трэба вымыць у моцным і халодным растворы солі, і тады непрыемны пах знікне.

Луска рыбы ачышчаецца лягчэй, калі яе апусціць на некалькі секунд у кіпячую ваду.

8. Каб адчуванне смагі паяўлялася рэдка, выхоўвае ў сябе звычку ўтрымлівацца ад частага піцця. Наталяйце смагу паступова, выпіваючы праз кожныя 10—20 мінут па некалькі глыткоў вады.

9. Ні пры якіх абставінах не накіроўвайце ствалы ружжаў у бок людзей. Пасля палявання ружжо неабходна неадкладна разрадзіць. Асабліва трэба быць асцярожным з ім пры пераадольванні перашкод — канаў, загараджэнняў, гушчароў і г. д.

10. Памятайце, што ў час навальніцы не рэкамендуецца знаходзіцца каля адзінокага дрэва або бегчы, стаяць на прыгорку або ўзвышшы. Добрае сховішча ад маланкі — густы лес (але не хавайцеся пад самымі высокімі дрэвамі), пячоры, падножжы крутых узгоркаў і скалаў.

Электрычны разрад часцей за ўсё ўдарае ва ўзвышаючыяся над зямлёй адзіночныя будовы, дрэвы ў палях, вяршыні ўзгоркаў, а таксама ў ідучага сярод поля чалавека.

11. Не шукайце абавязкова «свайго» месца для кастра, выкарыстоўвайце старыя кастрышчы. Зямля, дзе гарэў касцёр, доўгія гады застаецца мёртвай; тут не расце нават бур'ян.

Сусветная статыстыка сцвярджае: 97 працэнтаў лясных пажараў узнікаюць па віне людзей. Значыць, шкодзім прыроду мы самі — грыбнікі, паляўнічыя, турысты, удзельнікі вясёлых пікнікоў. Таму, прысаджваючыся з мілай кампаніяй да кастра ў самым прыемным настроі, будзем памятаць, што наша радасць можа лёгка абярнуцца бядой, згубай для прыроды і грамадства.

## ФОТАПАЛЯВАННЕ



**ЦІКАВА ВЕДАЦЬ**

# ЖЫВЫЯ ПОМНІКІ ПРЫРОДЫ

З любоўю захоўваюць людзі жывыя помнікі прыроды —рэліктавыя расліны, якія некалі былі высаджаны і выхаджаны іх продкамі.

На паўвостраве Мангышлак, былым Новапятроўскім умацаванні, расце манументальная вярба, пасаджаная некалі Тарасам Рыгоравічам Шаўчэнкам. Сасланы царом Мікалаем І у бязводны казахскі стэп, на працягу сямі год паэт упарта працаваў над тым, каб у пустыні вырас зялёны гай. Такі гай шуміць цяпер тут, ён аб'яўлен запаведным.

У вёсцы Прамухіна знаходзіцца парк, вырашчаны з кедравых арэшкаў, якія прыслалі з Сібіры дзекабрысты.

На беразе Волгі, ля горада Плёса, расце кедравы гай, пасаджаны ў 1878 годзе патомкам легендарнага Івана Сусаніна —Філарэтам Драздовым. Гай—своеасаблівы помнік Івану Сусаніну.

Можна з упэўненасцю сказаць, што ў кожнай вобласці і рэспубліцы ёсць сваё векавое дрэва —сведка вялікіх гістарычных падзей, якое карыстаецца асаблівай папулярнасцю сярод насельніцтва і бярэцца пад асаблівую ахову. У Беларусі, напрыклад, пад ахову ўзята 44 дубы, 15 елак, шмат іншых дрэў.

Чым цікавыя яны? Перш за ўсё гэта дрэвы-даўгажыцелі. Так, дубу, які расце ў Пажэжынскім лясніцтве, ужо больш як 650 год. Яго вышыня 42 метры, дыяметр 1,68 м.

Ля самай дарогі з г. Нясвіжа ў Гарадзею растуць, абняўшыся, сасна з дубам—своеасаблівы сімвал ляснога братэрства. У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты спрабавалі выкрасці гэтыя здзіўляючыя дрэвы і перавезці іх у Германію, у Берлінскі батанічны сад. Аднак партызаны не дазволілі фашыстам здзейсніць чарговае злачынства.

Вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва Беларусі карыстаецца «Сувораўскі дуб», ён расце ў м. Дзівін (Кобрынскі раён). Сцвярджаюць, што пад ім любіў адпачываць і працаваць вялікі палкаводзец Суvoраў.

# АЛОВАК АБВІНАВАЧВАЕ



**Без слоў.**



**— Прымі гэта, дарагая, у знак майго вялікага кахання.**



**— Глядзі, якой цудоўнай была паляна да нашага прыходу.**

